Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 33 (102) СУБОТА 10 ЛЮТАГА 1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Большэвіцкая агітацыя павінна быць канкрэтнай, даходлівай і змястоўнай

Мы ўступілі зараз у самы адказны перыяд выбарчай кампаніі. Тысячы агітатараў растлумачваюць масам веліч Сталінскай Канстытуцыі, Палажэння аб выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Новыя грамадзяне, якіх дзесяцігоддзямі атручвалі ядам паклёпу па адрасу СССР, жадаюць пачуць з вуснаў большэвіцкіх агітатараў аб гістарычных перамогах СССР, якім шляхам гэтыя перамогі дасягнуты. Выбаршчыкі цікавяцца міжнароднымі падзеямі і паўсюды задаюць на гэтыя тэмы масу пытанняў. Вось дзе сапраўды вялікае поле дзейнасці, вось дзе сапраўдная благародная работа для большэвіцкага агітатара.

Па даных гарадскіх і раённых камітэтаў партыі па нашай вобласці створана некалькі тысяч гурткоў, якімі ахоплены сотні тысяч чалавек. Гэта гаворыць аб вялікім размаху прадвыбарчай агітацыі, аб жаданні партыйных камітэтаў ахапіць сваім уплывам кожнага выбаршчыка, растлумачыць яму ўсе цікавячыя яго пытанні. Калі польскія заправілы хавалі сваю канстытуцыю ад народа, баяліся, каб народ не разабраўся ў яе ліцамер'і і ашуканстве, большэвіцкі агітатар павінен імкнуцца, каб кожны выбаршчык ведаў свае вялікія правы і абавязкі, бо Сталінская Канстытуцыя, кожны яе радок, кожнае слова прасякнуты любоўю да народа.

Комуністы заўсёды гаварылі і гавораць праўду народу на зразумелай і блізкай мове. „Яснасць прапаганды і агітацыі, — гаварыў Ленін, — ёсць асноўная ўмова. Калі нашы праціўнікі гаварылі і прызналі, што мы зрабілі цуды ў разгортванні агітацыі і прапаганды, то гэта трэба зразумець не знешнім выглядам, што у нас было многа агітатараў і было растрачана многа паперы, а гэта трэба зразумець унутраным выглядам, што тая праўда, якая была ў гэтай агітацыі, прабівалася ў галаву ўсіх. І ад гэтай праўды адхіліцца нельга“.

Поспехі ў нашай агітацыі велізарны. Але маюцца недахопы. Нашым агітатарам задаюць масу пытанняў аб жыцці рабочых і сялян у Совецкім Саюзе. Нашы агітатары з лічбамі і фактамі расказваюць аб сусветна-гістарычных перамогах совецкага народа, але не заўсёды падкрэсліваюць, якім чынам гэтыя перамогі дасягнуты. Шчаслівае жыццё народаў СССР заваявана ў жорсткай барацьбе з многалікімі ворагамі звонку і ўнутры нашай краіны. Народы СССР і зараз упарта працуюць, каб яшчэ больш абагаціць сваю краіну. Праца ў СССР — гэта аснова і крыніца ўсіх багаццяў. Праца ў СССР — гэта справа чэсці, доблесці і геройства. Гэтыя паняцці нашы агітатары павінны растлумачыць і прывіць гэтыя якасці совецкага народа новым грамадзянам вызваленых абласцей.

Большэвіцкая агітацыя павінна быць канкрэтнай. Мы можам і абавязаны расказаць выбаршчыкам не толькі аб дасягненнях усходніх абласцей СССР, але і паказаць, што дасягнута за чатыры з паловай месяца ў кожным горадзе, у кожнай вёсцы, на кожным заводзе нашай вобласці. Агітатар абавязан сабраць гэтыя матэрыялы і расказаць аб іх сваім слухачам. Мы сёння друкуем цэлую старонку матэрыялаў, у якіх агітатар знойдзе для сябе лічбы і факты, якія расказваюць, што дасягнута на нашай вобласці за 4,5 месяца. Калі агітатар умела скарыстае мясцовыя факты і падрыхтуе некалькі чалавек слухачоў свайго гуртка, якія раскажуць аб нядаўна мінулым, аб соцыяльным і нацыянальным прыгнёце ў былой Польшчы, гэта зробіць заняткі гуртка цікавымі і даходлівымі.

Большэвіцкая агітацыя павінна быць праўдзівай. Агітатар не можа адмахнуцца ад самых вострых пытанняў. Выбаршчыкі задаюць пытанні, звязаныя з недахопам ў разгортванні совецкага гандлю з работай транспарта і г. д. Агітатар абавязан растлумачыць насельніцтву прычыны гэтых недахопаў. Агітатар абавязан расказаць аб мерах, якія праводзяць совецкія органы па наладжванню ўсіх галін гаспадаркі.

Агітатар павінен быць ідэйна ўзброеным чалавекам і нястомна працаваць над сабой, каб быць гатовым у любую мінуту выкрыць антысовецкія вылазкі рэштак неразгромленых буржуазных і дробнабуржуазных партый. Калі справа ідзе аб пэпээсаўцах, аб бундаўцах, аэонаўцах, або іншай мразі, расказаць слухачам на канкрэтных прыкладах аб прадажніцкай ролі гэтых партый, аб іх раскольніцкай дзейнасці ў рабочым руху, аб іх нізкапаклонніцтве перад англа-французскімі падпальшчыкамі вайны. Матэрыялы аб дзейнасці гэтых партый агітатар знойдзе не толькі ў нашым друку, але варта яму пагаварыць з слухачамі свайго гуртка,—яны раскажуць агітатару яркія, канкрэтныя факты, назавуць імёны і прозвішчы гэтых здраднікаў рабочага класа і працоўнага сялянства.

Калі кожны гарком і райком, кожная пярвічная партарганізацыя з усёй сур'ёзнасцю падыдуць да падбору агітатараў, будуць імі кіраваць, дапамагаць і кантраляваць іх работу, мы забяспечым поўны поспех у прадстаячых выбарах. Кожны выбаршчык з поўнай свядомасцю прыдзе 24 сакавіка да выбарчых урнаў і аддасць свой голас за лепшых сыноў і дачок народа, за непераможны блок комуністаў і беспартыйных.

—«о»—

ОПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 8 лютага баявыя дзеянні на фронце абмяжоўваліся ў большасці выпадкаў пошукамі разведчыкаў. Прадаўжаўшыяся ў апошнія дні на Карэльскім перашэйку сутычкі перадавых пяхотных часцей прывялі да заняцця нашымі часцямі ўмацаванага раёна Хоціенен (раён Сумма) з 8 жалезабетоннымі артылерыйскімі пабудовамі. На ўчастку паміж Ладажскім возерам і Сувантоярві нашымі часцямі занята 5 абаронцельных артылерыйскіх жалезабетонных пабудоў. Праціўнік панёс у абодвух выпадках вялікія страты.

Наша авіяцыя рабіла паспяховыя баявыя палёты па ваенных аб'ектах.



На снимке: Политические занятия группы тов. Рытова. Отвечает отличник боевой и политической подготовки, младший командир тов. Железкин. Фото Б. Ярославцева.

НАКАНУНЕ XXII-й ГОДОВЩИНЫ РККА

В ЧЕСТЬ ПРАЗДНИКА

С большим политическим подъемом проходит подготовительная работа к 22-й годовщине Красной Армии в Н-й части. Все бойцы заключили между собой договоры социалистического соревнования, в которых обязуются притти к празднику с новыми успехами в боевой учебе. 9 февраля молодые бойцы части выполняли 1-ю задачу боевых стрельб из винтовки. Вся часть выполнила задачу на «отлично».

Праздничный вид принимают ленинские комнаты подразделений. В них устраивают витрины, показывающие достижения и рост боевого вооружения Красной Армии. Политруки подразделений провели беседы с бойцами о роли ВКП(б) и товарища Сталина в организации Красной Армии, о военной присяге и законе о всеобщей воинской обязанности.

Большая работа в части проводится по подготовке к выборам в Верховные Советы СССР и БССР. На избирательных участках 28 агитаторов проводят с местным населением беседы о Сталинской Конституции и избирательном законе. 3 человека руководят политическими кружками рабочих на подшефной фабрики.

ШЕФСКИЕ СПЕКТАКЛИ И КОНЦЕРТЫ ДЛЯ КРАСНОЙ АРМИИ

9 февраля в Белостоке состоялось первое заседание вновь организованной областной военно-шефской комиссии. Комиссия разработала и утвердила план художественного обслуживания бойцов в дни подготовки и проведения XXII годовщины Красной Армии.

Приезжающий из Витебска в Белосток второй Белорусский государственный драматический театр и Белостокская госфилармония для постоянной шефской работы закреплены за воинскими частями. Они выделяют своих работников для руководства коллективами красноармейской художественной самодеятельности. Несколько высококвалифицированных художников берут шефство над изостудией дома Красной Армии города Белостока. Шефство над воинскими частями также взяли все кинотеатры города и области.

23 и 24 февраля зрелищные предприятия и Дом народного творчества дают утренние шефские спектакли и концерты для бойцов и командиров. Белгосэстрада высылает 2 бригады артистов в части. Народный артист республики Молчанов выступит перед бойцами со своим творческим рапортом.

Большое количество шефских мероприятий проводит областной трест кинофикации. Каждый кинотеатр и авто-кинопередвижки в течение февраля один раз в шестидневку покажут в частях по одному бесплатному киносеансу. В кинотеатрах устраиваются выставки с показом достижений Красной Армии и вечера работников театров с красноармейцами из подшефных частей.

ГОТОВЯТ ОБОРОННЫЕ ПОДАРКИ

Москва. В связи с подготовкой к 22-й годовщине Красной Армии и Военно-Морского Флота СССР, на предприятиях столицы значительно усилилась массовая оборонная работа.

На заводе имени Баранова организуются стрелковые соревнования между цехами и отделами. Две стрелковые команды примут участие во всесоюзных соревнованиях Осоавиахима. Группа лыжников завода сдала нормы на значок ГПО. Создана школа медицинских сестер.

Молодежь метростроя отмечает день Красной Армии оборонными подарками. Комсомольская организация шахты № 22 подготовляет к сдаче нормы ПВХО 150 человек.

В последний час

АРЕСТЫ КОММУНИСТОВ В БЕЛЬГИИ

Париж, 9 февраля, (ТАСС). Как сообщает агентство Гавас, после обысков, произведенных властями в районах Монса и Шарлеруа (Бельгия), арестовано несколько коммунистов. Ожидаются дальнейшие аресты.

ТЕРРОР МАННЕРГЕЙМОВСКИХ БАНД

Берлин, 9 февраля. (ТАСС). Хельсинский корреспондент газеты «Вестдейчер беобахтер» описывает жуткие картины террора маннергеймовских бандитов. Белофинские власти, —пишет корреспондент, — насильно выбрасывают на улицу женщин, детей и стариков, угоняя их вглубь страны.

Когда выгнанные из Хельсинки мирные жители возвратились в город, белофинские власти немедленно выслали их вновь.

Далее корреспондент указывает, что население белофинского тыла голодает, так как все запасы хлеба уже иссякли. Совершенно нет также молока и других продуктов.

ПОЛЬСКИЕ ЗАГОВОРЩЕСКИЕ ОРГАНИЗАЦИИ В ЛИТВЕ

Каунас, 9 февраля. (ТАСС). Литовское телеграфное агентство опубликовало беседу своего сотрудника с министром внутренних дел Скучасом по поводу раскрытия в Вильно заговорщеских организаций польских офицеров.

«Органы нашей охраны,—заявил Скучас, — раскрыли в Вильно две польские организации, работавшие между собой в контакте. Их деятельность была направлена против литовской государственности. Члены этих организаций арестованы. Среди них лишь 17 процентов жителей Виленской области. Все же остальные прибыли сюда из других областей бывшей Польши, главным образом, осенью 1939 года. Данные следствия показывают, что обе организации начали усиленно формироваться сразу же после распада Польши.

Должен отметить, что вообще в Виленской области господствуют полный порядок и спокойствие».

Каунас, 9 февраля. (ТАСС). В Вильно закончилось следствие по делу первой заговорщеской организации польских офицеров. 13 человек передаются военному суду, 5—будут заключены в концентрационный лагерь.

ПО СОВЕТСКОМУ СОЮЗУ

ВЫПЛАТА КРУПНЫХ ВЫИГРЫШЕЙ

Подведены итоги выплаты выигрышей по последнему 9-му тиражу выигрышей займа 1938 года. Из восьми выигрышей по 25.000 рублей выплачено шесть. Три из них получили ленинградцы. Из 40 выигрышей по 10.000 рублей уже оплачено 28.

— Главное управление сберегательных касс дало распоряжение украинскому и белорусскому управлениям снабдить облигациями займа 1938 года сберкассы Львова, Белостока и других крупных городов западных областей БССР и УССР.

ДЕТЯМ О ЧАЙКОВСКОМ

Детский сектор Московской государственной филармонии наметил широкий план проведения столетнего юбилея со дня рождения П. И. Чайковского.

О жизни и творчестве талантливейшего русского композитора школьникам Москвы расскажут квалифицированные музыковеды. Силами лучших артистов Большого театра и Московской филармонии будет дано 50 концертов в Большом зале Консерватории, в Колонном зале Дома союзов, в школах и Домах пионеров.

АВИАРЕЙСЫ МОСКВА — МИНЕРАЛЬНЫЕ ВОДЫ

Коллектив молодых авиастроителей в прошлом году преподнес стране замечательный подарок. В воздух поднялся шестиместный самолет-гигант «Л - 760» типа «Максим Горький». В 1940 году самолет «Л-760» будет совершать пассажирские рейсы Москва — Минеральные воды.



На снимке: Новая спортивная машина автозавода имени Сталина «ЗИС-спорт». Фото-Клише ТАСС.

ДЕВУШКИ ЗА РУЛЕМ АВТОМОБИЛЯ

Обращение знатных девушек нашей родины — П. Ангелиной, П. Ковардак, М. Мухортовой и других — о подготовке ста тысяч трактористок нашло широкий отклик среди комсомолок и несоюзной молодежи Сумской области.

Недавно закончилась учеба девушек на курсах шоферов при тресте «Роменская нефтепромразведка». 18 девушек, среди которых 10 комсомолок, сдали зачеты на «отлично» и «хорошо».

Среди выпускниц — отличницы учебы комсомолки Надежда Козакова, Дуся Васюта, Таня Безверхова, Ксения Горошко.

Руководил курсами тов. Лисин, награжденный именными часами за отличную педагогическую работу по подготовке шоферских кадров. За 7 лет тов. Лисин подготовил свыше 2.000 шоферов.

г. Ромны, Сумской области, Украинской ССР.


Агітаваць канкрэтнымі фактамі

НАШЫ ДАСЯГНЕННІ ЗА ЧАТЫРЫ З ПАЛОВАЙ МЕСЯЦЫ Ў ЛІЧБАХ



Трафімчук Ф. з вёскі Тыльвіца, Беластоцкай вобласці, раней меў толькі 2 гектары зямлі на 10 чалавек сям'і. Цяпер ён атрымаў яшчэ 4 гектары памешчыцкай зямлі.

На здымку: Трафімчук са сваімі малодшымі дзяцьмі. Фото Сапір.



На тэкстыльных фабрыках Беластока ўсё шырэй разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва і рух многастаночнікаў.

На здымку: т. Каплан, рабочы фабрыкі № 18, за работай на двух станках. Фото Сапір.

Выконваючы загад Галоўнага камандавання, геройчная Чырвоная Армія 17 верасня перайшла граніцу былой польскай дзяржавы і ўзяла над сваю абарону адзінакроўных братоў—заходніх беларусаў і ўкраінцаў. Працоўныя гарадоў і сёл, абяздоленых вёсак, гібеўшыя ў жабрацтве, голадзе і бяспраўі, са слязамі радасці на вачах сустракалі сваю вызваліцельніцу. Яны ведалі, што нясе ім Чырвоная Армія, ачышчаючы сваім магутным поступам зямлю ад спрадвечных ланцугоў няволі, ад эксплаататараў і прыгнятальнікаў.

Над вызваленай зямлёй узышло сонца Сталінскай Канстытуцыі. Учарашнія рабы разагнулі вякамі прыгнутыя спіны і разам з усім совецкім народам будуюць грандыёзны, велічны будынак комунізма.

Прайшло ўсяго чатыры з паловай месяцы совецкай улады, створанай воляй народа, а якія вялікія змены адбыліся ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага жыцця.

Дасягненні, здабытыя працоўнымі нашай вобласці за кароткі перыяд, паказваюць, на што здольны вызвалены народ і якія магчымасці адкрываюцца перад ім у будучым.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

Заходняя Беларусь — краіна вялікіх прыродных багаццяў: тут ёсць усе ўмовы для развіцця прамысловасці на мясцовай сыравіне. Польскія імперыялісты вялі ў адносінах да Заходняй Беларусі каланізатарскую палітыку. Некаторыя галіны прамысловасці яны зусім знішчылі і тармазілі развіццё другіх. У выніку гэтага на тэрыторыі Заходняй Беларусі значная колькасць прадпрыемстваў заусёды бяздзейнічала. На 1 студзеня 1938 года 40 процантаў усіх прадпрыемстваў Заходняй Беларусі не працавала. У Беластоцкім ваяводстве на 1 студзеня 1938 года не працавала 36 процантаў прадпрыемстваў.

Усяго Беластоцкая вобласць к моманту прыходу Чырвонай Арміі налічвала 854 прамысловых прадпрыемствы; большасць гэтых прадпрыемстваў былі маленькімі, з дрэнным абсталяваннем, з незакончаным тэхналагічным працэсам і выключна цяжкімі ўмовамі працы.

Асноўная ў Беластоцкай вобласці тэкстыльная прамысловасць была прадстаўлена 154 прадпрыемствамі. Беластоцкія фабрыкі працавалі на нізкагатунковай сыравіне, якая складалася з 6,5 проціанта натуральнай шэрсці, 88 процантаў штучнай шэрсці і 5,5 процантаў бавоўны.

Нацыяналізацыя фабрык і заводаў перадала ў рукі працоўных 144 тэкстыльных прадпрыемствы, 59 скураных заводаў, 70 прадпрыемстваў мукамольнай прамысловасці, 56 харчовай, 67 лясной, 39 паліграфічных і 69 выраблявочых будаўнічыя матэрыялы.

Змяніліся адносіны рабочых да працы. Па выкліку калектыва Маскоўскага гіганта «Трохгорнай мануфактуры» тэкстыльшчыкі 1 і 2 камбінатаў Беластока заключылі дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва. У гэтым дагаворы беластоцкія тэкстыльшчыкі ўзялі на сябе абавязацельствы па датэрміноваму выкананню вытворчага плана 1940 г., па паляпшэнню якасці прадукцыі.

Пачаўся няўхільны рост прадукцыі на прадпрыемствах Беластоцкай вобласці. Калі месячная прадукцыя беластоцкіх фабрык сукна складала раней усяго 500 тысяч метраў, то ўжо ў лістападзе 1939 г. гэта прадукцыя дасягнула 800 тысяч метраў, а ў снежні—900 тысяч.

Значна павялічылася колькасць рабочых і служачых. Калі ў снежні 1938 года ў беластоцкай тэкстыльнай прамысловасці працавала ўсяго 4.220 чалавек, то ў лістападзе 1939 года лік рабочых на прадпрыемствах тэкстыльнага трэста дасягнуў 8.800 чалавек, а ў снежні—10.500 чалавек.

Рост колькасці рабочых назіраецца не толькі ў тэкстыльнай прамысловасці. У беластоцкім трэсце будматэрыялаў лік рабочых павялічыўся на 40 процантаў і складае зараз 1000 чалавек. На прадпрыемствах фанернага трэста лік рабочых узрос з 6.000 да 7.200 чалавек.

Вялікая работа прадстаіць у 1940 годзе. Фабрыкі тэкстыльнага трэста павінны даць у гэтым годзе 10 з паловай мільёна метраў добрага сукна. Распрацаваны план капітальных работ на тэкстыльных прадпрыемствах прадугледжвае затраты на суму 14 мільёнаў рублёў. 6.500.000 рублёў прадназначана на будаўніцтва прадзільнай баваўняна-папяровай фабрыкі, якая будзе выпрацоўваць пражу для беластоцкай шарсцяной прамысловасці.

400 тэкстыльных станкоў будуць прыстасаваны ў гэтым годзе да двухстаночнага абслугоўвання. У першай палове 1940 года камбінаты і фабрыкі тэкстыльнага трэста будуць у сярэднім працаваць у паўтары змены, а ў другой палове яны пяройдуць на двухзменную работу. Гэта выклікае павелічэнне колькасці рабочых яшчэ на 1000 чалавек.

Ёсць усе падставы меркаваць, што план тэкстыльнай вытворчасці на 1940 год будзе не толькі выканан, але і значна перавыканан. Гэтаму садзейнічае рост стаханаўскага руху. На другім камбінаце план за студзень выканан па пражы на 120 процантаў, а па ткацкаму цэху— на 110 процантаў.

Заводы фанернага трэста дадуць у бягучым годзе 150 тысяч кубаметраў прадукцыі, тады як у 1936-1938 гадах сярэдняя гадавая прадукцыя складала 100—110 тысяч кубаметраў.

На 60 процантаў больш, чым у 1939 годзе запланіравана прадукцыі на заводах беластоцкага трэста будматэрыялаў.

Пачалася арганізацыя торфаздабычы. 45,5 тысячы тон торфа будзе здабыта на працягу бягучага года.

У недалёкім будучым Беластоцкая вобласць з адсталага ваяводства ў былой Польшчы ператворыцца ў багатую прамысловую вобласць ордэнаноснай БССР.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Сельская гаспадарка ў былой панскай Польшчы была надзвычай адсталая. Польскія правіцелі ніякіх мерапрыемстваў не праводзілі для таго, каб падняць агратэхнічны ўзровень сельскай гаспадаркі. І не дзіва, што ўраджайнасць сялянскіх гаспадарак была зусім нізкая. Так, ураджай жыта не перавышаў 8 цэнтнераў з гектара. Малазямелле, малая колькасць жывелы і сельгасінвентара, не гаворачы ўжо аб складаных машынах, дрэннай якасці насення — усе гэта характарызуе становішча і агракультуру сельскай гаспадаркі.

Заветнай марай сялян была зямля. Лепшыя пладародныя землі належалі памешчыкам. Па даных 1938 года па Беластоцкай вобласці памешчыкам належала 16,6 проціанта ўсёй зямлі. Сотні сялян і батракоў зусім не мелі зямлі. Ім прыходзілася ад цямна да цямна працаваць на памешчыкаў за кавалак хлеба.

Такіх гаспадарак, якія мелі да 1 гектара зямлі, у Беластоцкім павеце налічвалася 4.787, у Аўгустоўскім павеце—580, Бельскім—1.270, Гродненскім—1.135, Граеўскім—937, Валкавыскім — 1.644, Ломжынскім — 1.692 і г. д.

Вось, што расказвае селянін з вёскі Тыльвіца, Заблудаўскай воласці, Феафіл Трафімчук:

— Я прадаваў апошнія пажыткі, каб сабраць грошай і купіць зямлі. Але памешчык Олдакоўскі прасіў 900 злотых за адзін гектар. На 900 злотых мне трэба было прадаць усё, што толькі мела гаспадарка.

Як жылося беззямельным, вельмі правільна сказаў Язэп Паўлоўскі з вёскі Капцёўка:

— За 20 год я ні разу ўволю хлеба не пад'еў, — вось што значыць жыццё пры капіталістах і памешчыках.

Такіх, як Феафіл Трафімчук і Язэп Паўлоўскі, былі тысячы.

Совецкая ўлада дала зямлю батракам, беззямельным і малазямельным сялянам. Зямлю атрымалі сапраўдныя гаспадары. Канфіскавана 577 памешчыцкіх маёнткаў. Батракі, беззямельныя і малазямельныя сяляне атрымалі 179.778 гектараў зямлі.

У Беластоцкім раёне 474 батрацкіх сямей атрымалі 2.145 гектараў ворыўнай зямлі і сенажацей, 710 беззямельных сялян атрымалі 1.454 гектары зямлі, паміж 2.297 малазямельнымі гаспадаркамі раздзелена 3.900 гектараў зямлі.

Якія змены адбыліся ў землекарыстанні, мы прывядзем прыклад з Заблудаўскай воласці. Усяго ў Заблудаўскай воласці ўдзельнічала ў раздзеле памешчыцкай зямлі 538 гаспадарак. З гэтага ліку 269 гаспадарак зусім беззямельных, 169 сялян, якія мелі раней ад 2 да 5 гектараў, 76 гаспадарак—ад 5 да 10 гектараў і 24—больш 10 гектараў. Пасля раздзелу зусім не стала беззямельных. 319 гаспадарак маюць да 5 гектараў, 189 да 10 гектараў і 30 гаспадарак—больш 10 гектараў.

Сяляне, атрымаўшыя зямлю, рыхтуюцца да першай совецкай веснавой сяўбы. Дзяржава аказвае ім у гэтым неабходную дапамогу.

НАРОДНАЯ АСВЕТА

Польскі ўрад, які складаўся з памешчыкаў і капіталістаў, не скупіўся траціць сродкі на будаўніцтва новых касцёлаў, на ўтрыманне велізарнейшых штатаў служыцеляў рэлігіі. Затое расходы на народную асвету скарачаліся з кожным годам. За апошняе двесяцігоддзе асігнаванні на народную асвету скараціліся на 20 процантаў.

Працоўныя ў былой Польшчы трымаліся ў страшэннай цемнаце. Па афіцыяльнай статыстыцы ў снежні 1931 года ў Польшчы было 5.536.377 непісьменных, гэта значыць што кожны чацверты грамадзянін, пачынаючы з 10-гадовага ўзросту, не ўмеў ні чытаць, ні пісаць. Асабліва высокі быў процант непісьменных ва ўсходніх і паўднёвых ваяводствах (зараз заходнія вобласці БССР і Украіны).

Школьная справа ў былой польскай дзяржаве знаходзілася ў глыбокім заняпадзе. Школьным узростам лічыўся ўзрост ад 7 да 13 год (у Совецкім Саюзе—ад 8 да 18 год). Па афіцыяльнай статыстыцы ў 1937—1938 вучэбным годзе 517.300 дзяцей гэтага ўзросту былі па-за школай, што складае 10 процантаў. У сярэднім па Польшчы 10 дзяцей з 100 не наведвала школу. У асобных ваяводствах гэта лічба значна перавышала сярэднюю. Так, у Валынскім ваяводстве з кожнай сотні дзяцей былі пазбаўлены магчымасці навучацца 28, у Палескім—21, у Беластоцкім—13. Характэрна, што найбольшая колькасць дзяцей па-за школай прыпадае на ўзросты ў 11—13 год. Так, у Валынскім ваяводстве роўна палова дзяцей 13-гадовага ўзросту не наведвала школу, у Беластоцкім—кожны трэці, у Навагрудскім—38 з 100 і г. д. Гэта гаворыць аб тым, што дзеці працоўных, не маючы сродкаў да існавання, вымушаны былі пакідаць школу і ісці зарабляць на пражыццё. Па ўсеагульнаму перапісу насельніцтва ў 1931 годзе больш 112.000 дзяцей да 14 год працавала на фабрыках, заводах і майстэрнях. А колькі дзяцей сялян былі пастухамі, нянькамі ў памешчыкаў і кулакоў. Так, паны рыдзы-сміглы, масціцкія і бекі кралі ў дзяцей самае ім дарагое—дзяцінства.

На тэрыторыі нашай вобласці не было ні адной вышэйшай навучальнай установы. Толькі зараз, пры совецкай уладзе, у Беластоку і Гродна ўпершыню адкрываюцца педагагічныя інстытуты. Ставіцца пытанне аб арганізацыі медыцынскага інстытута. Упершыню арганізаваны і, ўжо распачынаюць заняткі два педвучылішчы, якія будуць рыхтаваць настаўнікаў пачатковай школы.

Нашы дасягненні за чатыры з паловай месяцы совецкай улады ў галіне асветы цяжка пераацаніць. Перш за ўсё створаны ўсе ўмовы для сапраўды ўсеагульнага не толькі пачатковага, а і поўнага сярэдняга абучання. Зараз у вобласці адкрыты і працуюць 1.681 школа, у якіх навучаецца 297.051 вучань. Было-ж да рэарганізацыі пачатковых школ, гімназій і ліцэяў 1.498, у якіх навучалася 215.011 вучняў. Такім чынам, за кароткі перыяд існавання совецкай улады толькі ў нашай вобласці 82.040 вучняў, якія былі пазбаўлены магчымасці вучыцца, зараз уноў прыняты ў школы.

Ва ўмовах былой Польшчы не было ні адной беларускай і ні адной рускай школы. Зараз па вобласці працуюць 577 беларускіх школ, 20 рускіх, 77 яўрэйскіх, 20 літоўскіх і 987 польскіх.

Каля 100.000 дзяцей беларусаў навучаюцца на сваёй роднай, беларускай мове.

Нязмерна павялічыліся асігнаванні на народную асвету. Калі ў былой Польшчы на абучэнне аднаго грамадзяніна трацілася ў 1929—1930 годзе 20 злотых, у 1938—1939 — усяго 13 злотых, то ў Совецкім Саюзе на кожнага чалавека на асвету траціцца 124 рублі ў год. У заходніх абласцях БССР расходы на асвету значна вышэй сярэдніх па Саюзу.

У 1940 годзе запраектавана пабудаваць у нашай вобласці 18 новых сталінскіх школ, якімі будуць ахоплены літаральна ўсе дзеці школьнага ўзросту. На будаўніцтва адных толькі сельскіх школ запраектавана затраціць 3.145.000 рублёў, а ўсяго на вобласці — 9.445.000 рублёў. 4 мільёны рублёў будзе адпушчана на рамонт школьных будынкаў.

У гэтым годзе будуць пабудаваны Дом соцкультуры ў Беластоку, дзіцячыя сады ў Беластоку і Гродна, дзіцячы дом у Гродна і г. д.

На тэрыторыі вобласці было ўсяго 23 прыватных дзіцячых дамы. Зараз 29 дзяржаўных, якія ахапляюць каля двух тысяч дзяцей. Колькасць дзіцячых дамоў у гэтым годзе будзе даведзена да 32 з ахопам 3.000 дзяцей.

Дасягненні, здабытыя працоўнымі нашай вобласці ў галіне народнай асветы, гэта толькі пачатак найвялікшых перспектыў, якія адкрываюцца перад шчаслівай совецкай моладдзю на аснове вялікіх правоў, запісаных у Сталінскай Канстытуцыі.

АХОВА ЗДАРОЎЯ

У былой панскай Польшчы лячэбнай дапамогай маглі карыстацца толькі багатыя. На ахову здароўя дзяржава адпускала зусім нязначную суму сродкаў. Лячэбная сетка скарачалася з кожным годам. Аб становішчы сеткі аховы здароўя гавораць лічбы. У вёсцы былой Заходняй Беларусі адзін урач прыходзіўся на 9.000 жыхараў. На кожныя 10.000 жыхараў (у горадзе і вёсцы разам) было толькі 20 бальнічных ложкаў.

У Беластоцкай вобласці было 27 бальніц, з якіх толькі 13 дзяржаўных, і ўсе яны размешчаны былі ў гарадах, 5 бальніц належала розным таварыствам і 9 прыватным асобам. Амаль уся лячэбная дапамога ў бальніцах аказвалася насельніцтву за грошы. У дзяржаўных бальніцах плата бралася ад 3 да 8 злотых у дзень. У прыватных — за радзільны ложак плацілі 16 злотых у дзень.

Бальніцы былі толькі ў абласных і павятовых цэнтрах. Вёска была без урача. У вёсках дзесяткі сялян паміралі з-за адсутнасці медыцынскай дапамогі. Аб радзільных дамах вясковыя жанчыны нічога нават не чулі. Існавала 25 амбулаторый, і ўсе яны былі ў гарадах. На вёсцы было 12 так званых «цэнтраў здароўя». Сельскае насельніцтва 91 гміны вобласці фактычна не мела медыцынскай амбулаторнай дапамогі.

Як былы польскі ўрад «клапаціўся» аб ахове здароўя працоўных, яскрава сведчыць такі факт. У 1939 годзе на санітарныя мэты горада Беластока было асігнавана 2.555 злотых. На ахову здароўя ў 1939 годзе магістрат вызначыў 3.000 злотых.

З прыходам совецкай улады працоўныя вобласці атрымалі права на бясплатнае лячэнне. У Беластоцкай вобласці адкрыта 21 новая бальніца, 64 урачэбных амбулаторыі, 9 паліклінік, 4 фельчарска - акушэрскіх пункты, 3 акушэрскіх пункты, 3 станцыі хуткай дапамогі, 8 медыцынскіх пунктаў адкрыта на прадпрыемствах.

У 1940 годзе намечана адкрыць 29 бальніц, 48 амбулаторый, 14 кансультацый, 2 дамы груднога дзіцяці. Для дзяцей будуць адкрыты больш 20 яслей. Будуць адкрыты 2 медыцынскія школы ў Беластоку і Гродна, а таксама медыцынскі інстытут.

Раней працоўныя не маглі карыстацца дамамі адпачынку, курортамі. Курорт Друскенікі мае прапускную здольнасць 15 тысяч чалавек. Аднак на гэтым курорце адпачывалі толькі капіталісты — фабрыканты, памешчыкі. Зараз гэты курорт прыняты на дзяржаўны бюджэт. У ім пабываюць тысячы рабочых, якія ніколі не карысталіся курортамі і не маглі аб гэтым нават марыць.

ЛІКВІДАЦЫЯ БЕСПРАЦОЎЯ

Беспрацоўе ў былой Польшчы было звычайнай з'явай. Урад не прымаў ніякіх мер для яе ліквідацыі. Згодна б. польскага ўчоту, далёка недакладнага, у Беластоку ў ліпені 1938 года было 6.231 беспрацоўных. У студзені 1939 года лік беспрацоўных складаў у Беластоку 13.888 чалавек.

З прыходам совецкай улады пачалося няўхільнае скарачэнне колькасці беспрацоўных. За месяцы совецкай улады аддзеламі працы ў вобласці зарэгістравана 41.886 беспрацоўных. Паслана ўжо на пастаянную работу 21.318 чалавек, на часовую работу накіравана 2.193 чалавекі. У гор. Беластоку з 15.624 зарэгістраваных беспрацоўных паслана на работу 10.070 чалавек. 33.720 чалавек (большасць бежанцаў) паехалі ў розныя гарады СССР дзе таксама атрымалі работу.

Поўнасцю ліквідавана беспрацоўе сярод урачоў, настаўнікаў, інжынераў і тэхнікаў-будаўнікоў. 1.500 былых беспрацоўных настаўнікаў накіраваны абласным аддзелам народнай асветы ў школы. Поўнасцю ліквідавана беспрацоўе сярод рабочых паліграфічнай прамысловасці.

Працоўныя ўсходніх абласцей БССР даўно ўжо не ведаюць што такое беспрацоўе. Няма сумнення, што і ў заходніх абласцях ў хуткім часе зусім знікне гэтая цяжкая спадчына капіталістычнага ладу.

* * *

Мы прывялі некаторыя лічбы аб дасягненнях і перамогах, здабытых працоўнымі нашай вобласці за кароткі перыяд — чатыры з паловай месяцы існавання совецкай улады. Які кантраст атрымліваецца пры параўнанні гэтых лічбаў з лічбамі, узятымі з былой польскай дзяржавы! Такія тэмпы росту ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага жыцця нямыслімы ні ў адной капіталістычнай краіне, яны магчымы толькі ў нас, дзе ўлада належыць самім працоўным — рабочым і сялянам. Гэтыя перамогі сталі магчымымі таму, што намі кіруе комуністычная партыя і наш вялікі Сталін. Імення яму абавязаны народы заходніх абласцей сваім шчаслівым і радасным жыццём.

Перамогі і дасягненні, аб якіх мы гаворым зараз, гэта толькі пачатак творчай работы вызваленнага народа.

Т. Лясовіч
Г. Скупаня
М. [illegible]

ФАРМАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ

У партыйнай арганізацыі горвыканкома на першы погляд з вылучэннем агітатараў усё ў парадку. Арганізаван агіткалектыў з 39 чалавек. У спіску агітатараў комуністы, комсамольцы, профсаюзны актыў. Па словах сакратара парткома тав. Галейшы, агітатары наведваюць лекцыі пры Доме партыйнай асветы. Усё добра.

Але гэта толькі на першы погляд. У спіску агітатараў стаяць прозвішчы двух комсамолак Р. і А., працуючых у горвыканкоме. Мы праверылі, як яны рыхтуюцца да правядзення агітацыйнай работы на ўчастках. Аказалася, што яны не толькі не рыхтуюцца, але... нават не ведаюць, што іх вылучылі агітатарамі.

Такія факты маглі здарыцца толькі таму, што партарганізацыя горвыканкома і яе сакратар тав. Галейша аднесліся да вылучэння агітатараў, як кажуць, не сур'ёзна. Замест таго, каб арганізаваўшы агіткалектыў, распачаць з агітатарамі сталую падрыхтоўку іх да вялікай работы, якую яны будуць праводзіць з насельніцтвам, у партарганізацыі горвыканкома абмежаваліся складаннем спіскаў агітатараў.

Такія адносіны да падрыхтоўкі агітатараў пагражаюць зрывам ў разгортванні агітацыйна-масавай работы на ўчастках.

В. Іваноў.

ЯК НЕ ПАТРЭБНА ПРАВОДЗІЦЬ НАРАДЫ

У 6 гадзін вечара ў карыдорах Гродненскага горвыканкома сабраліся вылучаныя ў члены ўчастковых выбарчых камісій. Сюды-ж прышлі работнікі, вылучаныя для перапісу выбаршчыкаў. Сабралася каля 200 чалавек актывістаў выбарчай кампаніі.

Праз 30 мінут непатрэбнай таўкатні ў цёмных карыдорах, намеснік старшыні горвыканкома тав. Штэйнбах сабраў выбарчы актыў у адзін цесны пакой, раздзяліў іх на тры часткі і, заставіўшы адну частку ў пакоі, другіх адаслаў назад у карыдор.

Старшыня горвыканкома Ратайко з'явіўся на нараду са спазненнем на паўтары гадзіны. Калі да яго звярнуўся адзін з прышоўшых на нараду з пытаннем: „Калі пачнецца нарада?", то атрымаў адказ:

— Што вам да гэтага за справа?

Чалавек 60 сабраліся ў кабінеце сакратара горвыканкома тав. Бальшумова. Сядзець не было на чым. Усе стаялі. Сюды прышоў тав. Штэйнбах і пачаў нараду:

— Я чалавек адкрыты. Скажу вам проста, што работу па перапісу даверадь усім вам не будзем.

Для чаго быў патрэбен такі ўступ — не зразумела.

Затым зазваніў тэлефон. Нарада спынілася. І так некалькі разоў. Потым усе перайшлі ў другі пакой рэгістрыравацца, нарэшце, у трэці пакой для асабістай гутаркі з кожным. Увесь час у карыдоры была таўкатня, бо ніхто не разумеў, у які пакой і для чаго яму патрэбна ісці.

Патрэбна прама сказаць: добрая справа з-за непрадуманасці і непадрыхтаванасці была скомкана і не дала патрэбнага эфекту. Гэта нарада з'яўляецца лепшым паказнікам, як несур'ёзна адносяцца да такіх важных мерапрыемстваў кіраўнікі Гродненскага горвыканкома.

В. Гарбанёў
А. Перальман

ПРОИЗВОДСТВЕННЫЙ ПОД'ЕМ У ЖЕЛЕЗНОДОРОЖНИКОВ

Рабочие и служащие железнодорожного участка станции Бельск взяли на себя обязательство достойно встретить день выборов.

Весь коллектив рабочих и служащих станции с большим под'емом борется за выполнение взятого обязательства, проявляя образцы трудового энтузиазма. 60-ти летний рабочий Поплавский Станислав один перегрузил груз из 2-х вагонов, у которых перегорели буксы. Январский план погрузки коллектив железнодорожников выполнил на 230 %.

Высокую активность проявляет молодежь. 20-летний Новаренко В. является одним из лучших стрелочников железнодорожного участка. В ближайшее время из молодежи будет создана комсомольская молодежная смена.

В связи с необычайным производственным под'емом в честь избирательной кампании рабочие и служащие проявляют большое желание научиться работать лучше, освоить опыт стахановцев железнодорожного транспорта. Идя навстречу этим желаниям, управление участка в скором времени организует стахановскую школу.

Пысин.

ШЫРЫЦЬ РУХ ЗА БУДАЎНІЦТВА ДАРОГ І МАСТОЎ

Па прыкладу вілейскіх сялян

Ініцыятыва вілейскіх сялян па дарожнаму будаўніцтву шырока прымяняецца ў вёсках Гродненскага раёна. Сяляне актыўна ўключаюцца ў работу па будаўніцтву дарог.

У бягучым годзе горад будзе звязан з бліжэйшымі раённымі цэнтрамі і населенымі пунктамі добрымі дарогамі. Закончан рамонт Індурскага шасе і дарогі Сідзель—Масты. У гэтай рабоце актыўны ўдзел прымалі сяляне з мястэчка Вялікая Берастовіца. Удзел сялян у рамонце дарогі даў магчымасць закончыць увесь рамонт у сціслыя тэрміны. Сяляне Гожскай воласці закончылі пабудову і рамонт усіх невялікіх мастоў.

Зараз валасныя і сялянскія камітэты праводзяць вялікую работу па ачыстцы дарог ад снежных заносаў.

Праводзяцца мерапрыемствы па падрыхтоўцы да вясенняга і летняга будаўнічага сезона. Перш за ўсё ідзе загатоўка лесаматэрыялаў і камення. Толькі на адно скідзельскае шасе намячаецца загатовіць звыш 600 кубаметраў камення.

Гродненскі дарожны аддзел намячае вялікую праграму па дарожнаму будаўніцтву. Перабудавана будзе 5 вялікіх мастоў, сярод якіх мост праз Нёман, Свіслач і інш. У ягоў 1940 годзе будзе пабудавана і адрамантавана каля 50 кілометраў дарог.

В. Г.

Абавязацельствы сялян вёскі Аўгустова

Сяляне вёскі Аўгустова, Бельскага раёна, на сваім агульным сходзе рашылі пабудаваць сваімі сіламі дарогу з булыжнай мастовой, якая праходзіць з вёскі Аўгустова да Бельска працяжэннем 4 кілометры.

Сяляне заявілі, што будаўніцтва гэтай дарогі мае вялікае гаспадарчае значэнне. Пагэтаму яны аднадушна ўзялі на сябе абавязацельства пабудаваць дарогу, якая злучыць раённы цэнтр гор. Бельск і вёску Аўгустова. Будаўніцтва гэтай дарогі яны абавязаліся закончыць да першай гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі.

В. Гэс.

Падтрымліваюць ініцыятыву златораўцаў

Нядаўна адбыўся сход рабочых цэментнага завода ў Росі. На сходзе было абмеркавана пытанне аб дарожным будаўніцтве. Рабочыя завода горача падтрымалі ініцыятыву сялян вёскі Златорыя, Лапскага раёна, аб уключэнні ў дарожнае будаўніцтва.

Рабочыя і служачыя завода ўзялі на сябе абавязацельства актыўна ўдзельнічаць у пабудове дарогі Росі — Валкавыск. Яны абавязаліся адпрацаваць на дарожным будаўніцтве па 5 дзён і адначасова скарыстаць транспарт, які ёсць на заводзе.

Рабочыя выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва сялян вёсак Краснае Сяло і Калантай, а таксама мястэчка Рось.

С. Грышын.



Калгас імені Сталіна (Крымская АССР) атрымаў на сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве дыплом 1-ай ступені. У 1939 годзе даход гэтага калгаса складае 1.012.000 рублёў.

На здымку: калгаснікі звяраюць свае рахункі.

(Фото-кліше ТАСС).

У ПЕДАГАГІЧНЫМ ВУЧЫЛІШЧЫ

Прасторныя залы выдатнага трохпавярховага будынка па вуліцы Міцкевіча з самай раніцы 7 лютага напоўніліся галасамі і жыццерадасным смехам моладзі. Тут размясцілася першае ў гісторыі Беластока педагагічнае вучылішча, якое будзе рыхтаваць настаўнікаў пачатковай школы.

У кабінеце дырэктара людна. Усё яшчэ прыходзяць хлопцы і дзяўчаты з настойлівай просьбай аб прыёме. Ёсць наведвальнікі і другога роду.

Вось маці прынятай студэнткі Марыя Баса. Яна расказвае аб тым, як цяжка было ёй вучыць сваю дачку ў былой панскай Польшчы.

— Я адна зарабляла на ўтрыманне сваіх дзяцей і калекі мужа. Я хацела хоць крыху працерці вочы сваёй дачцы Мне ўдалося ўстроіць яе ў гімназіі. Але за вучобу трэба было плаціць. А ў мяне не было сродкаў. Я звярнулася ў воласць. Замест дапамогі пан войт прапанаваў:

— Мужычка, а ў навуку лезе. Няма чым плаціць, дык хай служыць ідзе.

І мая дачка вымушана была пакінуць гімназію. Зараз яе прынялі ў педагагічнае вучылішча. І не мне трэба плаціць за яе вучобу, а дзяржава будзе плаціць ёй стыпендыю. Але не ў гэтым толькі справа. Абыходжанне з працоўным чалавекам другое. Мной не пагарджаюць, з мяне не смяюцца, мяне не выганяюць за дзверы, не крычаць на мяне „хлопка". Вось за што я дзякую вялікаму нашаму другу і бацьку таварышу Сталіну.

У педвучылішча было падана 370 заяў. Вытрымалі іспыты і прыняты 220 чалавек. Хто яны паступіўшыя ў педвучылішча?

Іх састаў самы разнастайны ва ўсіх адносінах. Абсалютная большасць—гэта дзеці працоўных сялян, якія скончылі паўшэхныя школы і не мелі магчымасці вучыцца далей. Многія скончылі школы 2–3 і нават больш год таму назад.

50 процантаў паступіўшых—беларусы, каля 30 проц. — яўрэі, астатнія — палякі, рускія, украінцы. Узрост студэнтаў—ад 15 да 35 год. Былі заявы і ад людзей старэй 35 год. На адмаўленне ў прыёме яны скардзіліся: „А чым мы вінаваты, што совецкая ўлада спазнілася на некалькі год".

Сярод студэнтаў — дзеці дэпутатаў Народнага Сабрання Александр і Сцефанія Пырко і Раіса Андрэйчук.

Прыёмныя іспыты паказалі, што польская школа, забіваючы галовы дзяцей розным рэлігійным і шавіністычным хламам, не давала цвёрдых ведаў. Суцэльныя „дрэнна" і „вельмі дрэнна" атрымала большасць паступаючых па арыфметыцы, алгебры, геаметрыі і фізіцы. Так, напрыклад, Дудзінскі Генрых, які скончыў тры класы гімназіі, не мог адказаць на элементарныя пытанні па алгебры, геаметрыі і фізіцы. Па ўсіх гэтых прадметах ён атрымаў „дрэнна". Варашыла Еўгеній, які скончыў 7 класаў паўшэхнай школы і 2 класы музыкальнай школы, па арыфметыцы атрымаў „дрэнна", а па алгебры, геаметрыі і фізіцы зусім адмовіўся трымаць іспыты. Адмовіліся трымаць іспыты па алгебры, геаметрыі і фізіцы ўсе скончыўшыя паўшэхныя школы, бо гэтыя прадметы зусім не выкладаліся ў паўшэхнай школе. Ёсць цэлы рад прыкладаў, калі паступаючы вучыўся ў польскай школе на працягу 9—11 год і не вытрымаў іспыты ў педвучылішча.

Напярэдадні заняткаў адбыўся педагагічны совет, на якім былі абгавораны ўсе пытанні, каб вучобу пачаць арганізавана з першага дня. Вучылішча укамплектавана высокакваліфікаванымі выкладчыкамі. Заняткі пачаліся па цвёрдаму раскладу. У вучылішчы ёсць добра абсталяваныя нагляднымі дапаможнікамі кабінеты фізікі, прыродазнаўства, добры фізкультурны зал.

Адначасова з заняткамі пачата палітмасавая работа. Складзен план на люты і сакавік, які прадугледжвае арганізацыю сямі гурткоў па вывучэнню Палажэння аб выбарах, гуртка па вывучэнню статута і праграмы комсамола і цэлага раду гурткоў мастацкай самадзейнасці.

У бліжэйшы час намечана правесці для студэнтаў даклады і лекцыі аб ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы, аб выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, аб Чырвонай Арміі, аб міжнародным жаночым дні, аб 80 гоадзі з дня нараджэння А. П. Чэхава, на антырэлігійныя тэмы і г. д.

Заняткі пачаліся. Выкладчыцкі і студэнцкі калектыў гарэць адным жаданнем — падрыхтаваць для соцыялістычнай радзімы новы атрад совецкай інтэлігенцыі.

Тэляс.

Герои боев с белофиннами

Один из многих славных

Иван Ершов — приземистый, коренастый человек, с лицом, как бы высеченным из камня. Ничего приметного нет в нем — вот только серые глаза искрятся из-под рыжеватых бровей да улыбка, теплая, хорошая, освещает лицо. Он вятский крестьянин из деревни Ершово; в этой деревне, как у нас нередко водится, — все Ершовы.

— Вот и я ершистой породы,— смеется он, — кругом, куда ни глянешь, — одни ерши — мелкая рыба.

В этом небольшом человеке заложена, однако, большая сила.

Иван Ершов, политрук 3-й роты ныне прославленного 81-го полка, принадлежит к числу тех наших командиров и комиссаров, какие воспитаны и взращены Красной Армией. Пять лет назад он начал свою службу с рядового бойца. За эти годы Ершов стал, по его собственным словам, совершенно другим человеком.

30 ноября 1939 года навсегда останется в памяти Ивана Ершова. Стояла черная ночь, когда полк поднялся по тревоге. Собрав бойцов своей роты в круг, политрук Иван Ершов держал речь. Он говорил словами простыми и бесхитростными о белофиннах, о воинской присяге, о нашей матери-родине, о любви советского человека к своей великой отчизне. Иван Ершов протянул руку на запад

— Товарищи, — сказал он,— сегодня мы идем туда!

Третья рота двинулась первой. Финский кордон был захвачен без звука. Лес расступался перед бойцами. Утро вставало холодное, падал снег. Гремели пулеметы, раздавались винтовочные выстрелы: разведчики обнаружили врага. Первым был ранен Николай Новиков, пулеметчик, отличный боец. Он долго крепился, не показывая вида, чтобы не смущать своих товарищей, но, наконец, силы оставили его.

— Ребята, действуйте без меня, — сказал он. — Набейте финнам морду за меня, а я поправлюсь — не бойтесь...

Иван Ершов и командир роты лейтенант Ардельян наблюдали за бойцами. Как они ведут себя под огнем? Боевое крещение — самый ответственный момент в жизни части. Но нет, смелые ребята в роте Ивана Ершова — держатся отлично, с такими не пропадешь!

Незаметно погас короткий северный день. Опять тьма окутала лес. Близкое зарево окрашивало небо — горело селение Ю., подожженное финнами. Бой затих. Был дан первый привал...

Политрук и командир собрали бойцов, обсудили тактику финнов. Враг слабый, но коварный — идет на всякие хитрости и уловки. Решили: бить врага его же оружием...

Утром тронулись дальше. Как и в первый день, был Иван Ершов впереди, подбадривая бойцов. Появление его приземистой, коренастой фигуры всегда вносило успокоение и какое-то чувство уверенности. Он и двигался не спеша и говорил медленно, но все кругом чувствовали, что вот подошел человек, который несет с собой успех.

— Наш Иван Афанасьевич топает по лесу, как хозяин, — говорили про него бойцы...

А «топать» было вовсе не легко. Лес был наполнен выстрелами, противник то исчезал, то появлялся вновь. Он не устрашал, а раздражал и надоедал. Но вот и речка, переправа, у переправы — противник...

Среди бойцов возникает заминка. Тогда поднимается Иван Ершов, внешне спокойный, как всегда.

— Вперед, товарищи. Раздолбаем финнов, как миленьких. Давай!

Рота поднялась вслед за Ершовым и бросилась вперед. Финны не выдержали. Кидая оружие, они откатились в лес. Переправа осталась за нами.

— Ну вот, — сказал Иван Ершов, — только и всего делов!

После боя политрук, превозмогая усталость, обошел всех бойцов, одного подбодрил, другого обругал, третьего похвалил.

— Смелого пуля боится, а труса всегда найдет. Не забывай об этом, — говорил он.

Иван Ершов вместе с командиром проверил, кто как обут, одет, последил, чтобы бойцы были накормлены. Лишь после этого он присел на пенек, распахнув полушубок. Полушубок был мокрый от пота...

К ночи рота заняла хутор Ш.

Иван Ершов поделился с одним из крестьян своими консервами. Маленькой белокурой девочке дал кусок сахару. Девочка улыбалась.

Вошли в дом. Хозяин у которого от первоначального страха не осталось и следа, завел патефон. Иван Ершов слушал музыку. Голова его клонилась от усталости, но спать было некогда: надо было итти вперед и вперед...

И так бежали дни, наполненные боями, и тревожные ночи в лесу с каким-то полузабытьем вместо сна.

Ершов вспоминает боевые схватки, — их было много за эти немногие дни. Вспоминает, как рота штурмовала высоту близ городка С., как люди шли в бой с возгласами: «За Сталина, за родину!», как бежали белофинны, устилая трупами заснеженный косогор.

— Доконаем мы их, белую рвань, — думает политрук.

9 декабря рота с боем заняла вторую переправу. Враг нажимал, ведя фланкирующий огонь Положение с каждым часом становилось все более и более напряженным. На какой-то период противнику удалось прервать связь. Силы его возрастали.

Рота отбивалась отчаянно. Отступать было некуда. Враги лезли со всех сторон. Сто человек решили умереть, но не сдаваться. Командир роты лейтенант Ардельян был ранен. Превозмогая боль, он продолжал руководить обороной. Вторая пуля сразила его в сердце.

Иван Ершов склонился над другом-командиром. Слезы навернулись на глаза, но морозный ветер высушил их.

Ершов сказал:

— Жалко, жалко-то как... Товарищи, — продолжал он, обращаясь к бойцам, — это финнам даром не пройдет. Правильно я говорю?

Иван Ершов был ранен в ногу. Он пытался скрыть свою рану от товарищей, но кровь пропитала валенок и оставляла след на снегу. Ершова отправили в госпиталь...

Через два дня он попытался потихоньку удрать из госпиталя. Ершова остановили на полдороге. Врач долго его совестил, а потом, рассердившись, кричал и топал ногами.

— Вы с ума сошли, —говорил он, — да вам еще надо три недели лежать минимум. Я вам предлагаю...

— Доктор, понимаете, не могу... Рота. Товарищи.

— К чорту. Запрещаю и думать об этом. Теперь я за вас отвечаю.

Иван Ершов, проклиная медицину на чем свет стоит, покорился своей участи.

Недавно он узнал о своем награждении орденом Ленина. Взволнованный и потрясенный, он написал родителям в деревню Ершово и товарищам в роту. Потом стали приходить поздравительные письма от знакомых и незнакомых.

Писала какая-то девушка из Ленинграда: «Мой герой. Я завидую вам и радуюсь за вас. Я не знакома с вами, но представляю вас отчетливо: вы наверное, высокий, красивый, у вас карие глаза...».

— Не угадала, — смеялся Ершов...

И вот, наконец, его выписали из госпиталя. Он простился с врачами тепло и задушевно, но с неприличной быстротой. Он поехал в роту немедленно, как только представилась возможность. Его родной 81-й полк был к этому времени награжден орденом Красного Знамени.

Н. Кружков.

ПЯЦЬ МЕСЯЦАЎ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ

Прайшло пяць месяцаў вайны, пачатай Англіяй і Францыяй супроць Германіі. На першы погляд можа паказацца, што ваенныя дзеянні на заходнім фронце разгортваюцца вельмі павольна. Сапраўды, ваенныя аперацыі на сушы і зараз яшчэ абмяжоўваюцца дзеяннямі разведвацельных часцей, артылерыйскай і кулямётнай перастрэлкай, сутычкамі мясцовага характару. Аднак, гэта не тлумачыцца тым, што англа-французскі блок агрэсараў не жадае разгортваць вайны супроць Германіі. Будзе правільна тлумачыць гэта тым, што прарыў германскай умацаванай лініі Зігфрыда патрабаваў-бы вялікіх людскіх і матэрыяльных ахвяр з вельмі няпэўным канечным вынікам.

Вайна на моры разгарнулася значна больш шырока. За пяць месяцаў Англія ўжо страціла такія буйныя караблі, як „Карэйджэс" і „Ройал окк", некалькі эсмінцаў і падводных лодак. Германія страціла лінкор „Адмірал граф Шпее" і некалькі падводных лодак. Страты гандлёвага флота, асабліва англійскага і належачага нейтральным краінам, вельмі вялікія. З усяго гэтага следуе, што сучасная вайна разлічана галоўным чынам на эканамічнае знясіленне праціўніка.

Англія ўсяляк імкнецца пазбавіць Германію магчымасці ўвозіць ваенную сыравіну, захапіць германскія рынкі збыту тавараў, прымусіць нейтральныя краіны, раней гандляваўшыя з Германіяй, весці гандаль выключна з Англіяй. Навязваючы гэтым краінам, свой гандаль, Англія імкнецца павярнуць іх супроць Германіі. Нядаўняе выступленне англійскага марскога міністра Чэрчыля з пагрозамі супроць нейтральных краін ярка сведчыць аб намеры Англіі акружыць Германію, стварыць супроць яе новыя франты. Асаблівую ўвагу Англія ўдзяляе арганізацыі „паўночнага фронта", г. зн. скандынаўскім краінам — Швецыі і Нарвегіі. Выкарыстоўваючы як прадлог, „дапамогу" манергеймаўскім бандам у бела-Фінляндыі, Англія патрабуе ад Швецыі і Нарвегіі пропуска праз іх тэрыторыі ўзбраення, вядзе раз'юшаную кампанію за іх уцягненне ў вайну супроць Германіі.

Адначасова, Англія імкнецца стварыць новы фронт і ў паўднёваўсходняй Еўропе — на Балканах. Ёй ужо ўдалося прымусіць Турцыю адступіць ад поўнага нейтралітэта і падпісаць „пакт аб узаемадапамоге" з англа-французскім блокам. Англія таксама дала аднабаковыя гарантыі Грэцыі і Румыніі для таго, каб у патрэбны момант выкарыстаць гэтыя краіны ў інтарэсах імперыялістаў. На бліжнім усходзе — у Сірыі — Англія і Францыя скалачваюць армію ў 250 тысяч чалавек, якая ў любы момант можа быць выкарыстана для стварэння нова фронта імперыялістычнай вайны. Англа-французскі друк поўны правакацыйных паведамленняў „аб пагрозах нейтральным краінам з боку Германіі і СССР".

Гэтыя ілжывыя паведамленні цалкам разлічаны на запалохванне нейтральных краін і ўцягненне іх у вайну на баку Англіі і Францыі.

Мінуўшыя пяць месяцаў вайны паказалі, што сапраўднымі мэтамі англа-французскіх імперыялістаў з'яўляецца пашырэнне вайны, уцягненне ў яе новых краін.

Аднак, у тылу імперыялістаў— у самай Англіі і Францыі, не гледзячы на жорсткія праследаванні, расце антываенны рух, павялічваецца нездавальненне палітыкай імперыялістаў, абракаючай на пагібель сотні тысяч людзей для нажывы кучкі банкіраў і капіталістаў.

У гэтых умовах Савецкі Саюз будзе яшчэ больш цвёрда праводзіць палітыку міра і ўсямернага ўмацавання сваіх граніц, напарокор усім і ўсялякім правакацыям з боку падпальшчыкаў вайны. Наша слаўная Чырвоная Армія, пры актыўнай падтрымцы фінскага народа, з чэсцю ажыццяўляе сваю свяшчэнную задачу па знішчэнню антысавецкага гнязда ў манергеймаўскай Фінляндыі — крыніцы вайны ў паўночна - ўсходняй Еўропе. Выконваючы ўказанне вялікага Сталіна, народы СССР знаходзяцца ў пастаяннай мабілізацыйнай гатоўнасці, і ніякія прошукі падпальшчыкаў вайны не застануць нас знянацку.

ЗА РУБЕЖОМ

Проводимые в Англии, в связи с войной, затемнения вызвали огромный рост числа автомобильных катастроф. По официальным данным за первые четыре месяца войны в результате автомобильных аварий убито 4133 человека — почти в два раза больше, чем за этот же период прошлого года.

АНГЛИЧАНЕ ТРЕБУЮТ БОМБАРДИРОВКИ ГЕРМАНСКИХ ГОРОДОВ

Берлин, 8 февраля. (ТАСС). Германское информационное бюро передает из Гааги, что требование бомбардировки германских городов, которое было выдвинуто недавно английским писателем Гербертом Уэльсом, дало повод ряду английских журналов выступить с подобными же требованиями. Так, например, журнал «Ньюс ревью» пишет: «Необходимо нанести несколько значительных ударов германскому народу и бомбардировать промышленные предприятия. Английские военно-воздушные силы должны напасть... на большие промышленные центры Западной Германии. Эту бомбардировку нужно производить, не останавливаясь перед тем, что случайно жертвой бомбы может стать мирное население».

Антианглийское движение в Эйре

Лондон, (ТАСС). 5 февраля в Эйре по всей стране проходили митинги протеста против вынесенного английским судом смертного приговора двум ирландцам — членам националистической организации «Ирландская республиканская армия». Ирландские националисты были приговорены к смертной казни по обвинению в организации взрыва в Ковентри.

На митингах в Эйре были приняты резолюции с требованием отмены решения суда.

Движение в США против помощи маннергеймовской банде

Нью-Йорк, 9 февраля. По сообщению агентства Юнайтед Пресс, студенты Стенфордского университета (Калифорния) отказались участвовать в гуверовской кампании помощи бело-Финляндии. Ассоциация американских спортсменов-теннисистов также отказалась от участия в этой кампании.

Нью-Йорк, 9 февраля, (ТАСС). Как сообщает «Дейли уоркер», в Нью-Йорке состоялся многолюдный митинг против оказания США помощи бело-Финляндии. На митинге присутствовало 2 с половиной тысячи человек. Среди выступавших были известная журналистка Анна Луиза Стронг, протестантский священник Гаррис, редактор финской газеты Коуглен и другие. Ораторы заявили, что нынешний террористический режим в Финляндии полностью несет ответственность за войну, начатую против Советского Союза.

Участники митинга в своей резолюции требовали, чтобы США не оказывала никакой помощи бело-Финляндии.

(ТАСС)

ГОЛАД І НІШЧАТА Ў БЕЛА-ФІНЛЯНДЫІ

Насельніцтва тэрыторый, занятых белафінамі, перажывае выключныя нястачы і бедствы. Голад і нішчата сталі звычайнай з'явай у белафінскіх гарадах і вёсках. Нават белафінскі друк вымушан прызнаць наяўнасць голаду ў радзе раёнаў краіны. Газета „Усі суомі" 23 студзеня паведаміла аб тым, што зніклі запасы хлеба.

Харчаванне белафінскага салдата састаіць выключна з гарохавага супа і аўсянай кашы. Адзначаны масавыя факты незадавальнення фінскіх салдат. У насельніцтва насільна адабраны манергеймаўскімі бандытамі ўсе запасы адзення. Нехапае паліва.

* * *

Шведская газета „Ню даг" апублікавала пісьмо вядомага фінскага сацыял - дэмакрата, былога дэпутата сейма Мауры Рюэмя, у якім ён заяўляе, што фінскіх рабочых насільна адпраўляюць на фронт. Фінскі рабочы клас, піша Рюэмя, заўсёды быў адзінадушан у сваім жаданні захаваць дружалюбныя адносіны з Савецкім Саюзам.

Як зараз стала вядома, паведамляе газета „Ню даг", гэта пісьмо Рюэмя папала ў рукі белафінскай ахранкі, і Рюэмя быў схоплен жандармерыяй. Жыццё яго знаходзіцца ў небяспецы. (ТАСС)



Бело-финн: Кто не хочет отступать с нами, может остаться...
Рыс. Отарова (Фото-клише ТАСС).

КОНЦЕРТЫ ИОСИФА КАМЕН

Камен — это театр без грима. Определение это вернее всего характеризует талантливого артиста. Он один изображает самых разнообразных людей всевозможных возрастов, национальностей. Старуха, юноша, полицейский, японский банкир, китайский кули — все они живут полнокровной жизнью в его пластическом изображении. Его мимический талант поразителен. Голос его поражает также музыкальностью и ритмичностью звука.

Особенно большое впечатление произвело исполнение произведений: «Джим» (текст Надира) и монтаж «Шанхай».

Джим — это бедный негр, кочегар на пароходе. Он душится в своем тесном помещении, а в это время на палубе миллионеры под звуки джаза и звон бокалов беззаботно предаются веселью. Джим мечтает о том, что настанет время, когда и он выйдет на палубу танцовать и веселиться.

В 8 сценах «Шанхая» изображена тяжелая обстановка угнетенного китайского народа, порабощенного мировым капитализмом. Зритель слышит и почти видит властного англичанина, коварного японца, китайского кули, борющегося против поработителей.

Сильное впечатление произвели также и отрывки из популярного «Швейка» чешского писателя Хашэка и «На мельнице».

В концерте принимали также участие и другие артисты «Белгосэстрады»:

Виолончелист Бакман хорошо исполнил «Венгерскую рапсодию» Поппера, «Еврейскую мелодию» Бруха, «Лет шмеля» Римского-Корсакова и др.

Надя Карени с воодушевлением спела свежим сильным голосом несколько еврейских песен, веселую биробиджанскую плясовую и песню Дунаевского из фильма «Волга-Волга».

Анета Рейзер показала хореографическую картину «Еврейская свадьба», знакомую нам из программы театра миниатюр, и танец «Юдифь».

М. Ф.

Продвижение кино в деревню

До прихода в Западную Белоруссию Красной Армии и до образования здесь советской власти крестьяне сел и деревень никогда не видели кино. Правда, при панской власти по всей территории Западной Белоруссии функционировали две кинопередвижки. Принадлежали они ксендзам, которые, кроме религиозных картин, ничего на экран не пропускали.

Неудивительно, что когда в деревню Вульки (Пинская область) прибыла кинопередвижка и крестьяне увидели на экране движение, все зрители разбежались. В деревне не нашлось ни одного человека, который бы видел когда-нибудь кино. И это не единичный случай.

Сейчас кино крепко входит в быт деревни. Сейчас по деревням и селам одной только Белостокской области работает 13 кинопередвижек. За последние два месяца по глухим деревням показано более 2.000 киносеансов. Десятки тысяч крестьян увидели на экране лучшие советские кинофильмы: „Человек с ружьем", „Ленин в октябре", „Ленин в 1918 году", „Чапаев", „Крестьяне" и многие другие картины.

Число кинопередвижек растет. В марте по Белостокской области будут работать уже 26 кинопередвижек.

Среди киномехаников сейчас развернулось социалистическое соревнование. Каждый механик обязался в дни выборчей кампании ежедневно показывать по три сеанса.

Г. К.

ЧЫРВОНЫ АБОЗ З ХЛЕБАМ

Бельск, (Па тэлефону). Чырвоны абоз з хлебам у часць выбарчай кампаніі арганізавалі сяляне вёскі, Зубава Бельскага раёна. На элеватар дастаўлена 200 центнераў зярна.

Песочын.

ВЫЕЗД АГІТБРЫГАДЫ

БЕЛЬСК. (Па тэлефону). Днямі агітбрыгада ў саставе 12 лыжнікаў выязджала ў вёскі Проневічы і Гаркі Бельскага раёна. У гэтых вёсках брыгадай праведзены сходы сялян, на якіх былі пастаўлены даклады аб Сталінскай Канстытуцыі і выбарчым законе. Пасля сходаў наладжваліся гульні і танцы.

ПЕРАМОГА БЕЛАСТОЦКІХ ШАХМАТЫСТАЎ

ГОМЕЛЬ, 9 лютага (Па тэлеграфу). На працягу трох дзён адбываліся таварыскія сустрэчы паміж шахматыстамі Беластока і Гомеля. Ва ўсіх гэтых сустрэчах перамога засталася за беластачанамі. Агульны вынік 8:7.

Заўтра беластоцкія шахматысты сустрэнуцца з шахматыстамі Мінска.

Бракер

Адказны радактар
Б. М. Зельманаў

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнога рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага. літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газэту прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абЛліта № 138. 1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.